Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

DOI:10.17951/sb.2022.16.87-114
Studia Białorutenistyczne 16/2022 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Ihar Zaprudski / Ігар Запрудскі

Belarusian State University, Minsk (Belarus)
e-mail: zaprudzki@gmail.com
https://orcid.org/0000-0003-4232-7610

Быліцы, расказы Навума Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча: творчая гісторыя і супярэчнасці ідэйна-мастацкай інтэрпрэтацыі

„Tales, stories of Navum" by Vincent Dunin-Marcinkievich: Creative History and Contradictions of Ideological and Artistic Interpretation

„Opowieści, historie Nauma" Wincenta Dunina-Marcinkiewicza: historia twórcza i sprzeczności interpretacji ideologicznej i artystycznej

Abstract

The article is devoted to the creative history, the circumstances of the first publication in 1946 and turns of reception in Belarusian literary criticism of *Bylicy, raskazy Navuma (Tales, Stories of Navum)* (1857) by Vincent Dunin-Marcinkievich, the last (sixth) in the cycle of Belarusian epic poems of the writer. In the 1850s the genre of travel became especially popular in multilingual Belarusian literature, there were discussions about the creation of written literature for people, which influenced on the content and form of *Bylicy, raskazy Navuma.* Experimentalism, complexity, the fundamental denial of orientation on artistic ethnography, the connection of issues with the current socio-political questions of the epoch, the image of a new hero-peasant, a distinctive representative of the Homeland, the opposition of *local / foreign*, complicated composition with two independent components *Zlaja žonka (Angry wife)* and *Chalimon na karanacyi (Khalimon at the coronation)* became dominant and artistically important methods of achieving expected reader's impression. The peculiarities of the author's worldview, the relevance of topics, specifics of the genre, compositional distinctiveness and poetics have become the cause of debatable aspects in the ideological and artistic interpretation of the work by well-known domestic literary critics. In the 1930s, according to vulgar sociological assessments V. Dunin-Marcinkievich was characterized as reactionary writer-slave, *Bylicy…* was qualified as a contradictory work and full of tsarist illusions. The role of Belarusian researchers of the second half of the 20th – early 21st centuries has been traced in denying the primitive interpretive schemes of vulgarizers. The significance of *Bylicy…* in the process of the author's creative evolution and in the history of national beautiful writing is clarified.

Keywords: creative history, tales, travel, reception, interpretation, composition

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Abstrakt

Artykuł został poświęcony historii, pierwszemu wydaniu w 1946 r. oraz recepcji w białoruskich studiach literackich *Opowieści, opowiadań Nauma* (1857) Wincentego Dunina-Marcinkiewicza – ostatniego (szóstego) z cyklu dzieł poetyckich pisarza w języku białoruskim. W latach 50. XIX w. w wielojęzycznej literaturze Białorusi szczególną popularność zyskał gatunek podróżniczy, jednocześnie toczyły się mające wpływ na treść i formę *Opowieści*… dyskusje o tworzeniu literatury „podręcznej" dla ludu. Utwór cechował eksperymentalizm, wielopoziomowość, odrzucenie *a priori* metody etnograficznej, związek z aktualnymi problemami społeczno-politycznymi epoki, wprowadzenie wizerunku nowego bohatera pochodzącego z ludu, a także – antynomia *swój* / *obcy* oraz złożona kompozycja składająca się z dwóch samodzielnych części *Zła żona* i *Chalimon*. Znani krajowi literaturoznawcy podjęli szereg dyskusji dotyczących między innymi światopoglądu Dunina-Marcinkiewicza, aktualności tematu jego utworu, specyfiki gatunkowej dzieła, jego poetyki oraz odrębności kompozycyjnej. W latach 30. XX w., na podstawie fałszywych przesłanek socjologicznych W. Dunin-Marcinkiewicz został zaliczony do kategorii pisarzy reakcyjnych, natomiast *Opowieści*... zakwalifikowane jako dzieło kłamliwe, nasycone iluzjami do caratu. Autor artykułu opisuje rolę białoruskich badaczy drugiej połowy XX – początku XXI w. w procesie obalania mitów opartych na prymitywnych schematach interpretacyjnych, ponadto określa znaczenie utworu w procesie ewolucji artystycznej autora i historii rodzimej litertury pięknej.

Słowa kluczowe: historia utworu literackiego, opowieść, gatunek podróżniczy, recepcja, interpretacja, kompozycja

Анатацыя

Артыкул прысвечаны творчай гісторыі, акалічнасцям першай публікацыі ў 1946 г. і перыпетыям рэцэпцыі ў беларускім літаратуразнаўстве *Быліцаў, расказаў Навума* (1857) Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, апошняга (шостага) у цыкле беларускамоўных твораў паэтычнага эпасу пісьменніка. У 1850-я гады жанр "падарожжа" набыў асаблівую папулярнасць у шматмоўнай літаратуры Беларусі, вяліся дыскусіі пра стварэнне „кніжнай" літаратуры для народа, што паўплывала на змест і форму *Быліцаў*… Эксперыментальнасць, шматпланавасць, прынцыповае адмаўленне ад арыентацыі на мастацкі этнаграфізм адлюстравання, сувязь праблематыкі з актуальнымі грамадска-палітычнымі пытаннямі эпохі, вобраз новага героя-селяніна, адметнага рэпрэзентанта радзімы, проціпастаўленне свой/чужы, ускладненая кампазіцыя з двухчасткавых самастойных кампанентаў *Злая жонка* і *Халімон на каранацыі* сталі дамінантнымі і па-мастацку важнымі прыёмамі дасягнення чаканага чытацкага ўражання. Асаблівасці светапогляду аўтара, актуальнасць тэматыкі, жанравая спецыфіка, кампазіцыйная адметнасць і паэтыка сталі прычынай дыскусійных аспектаў у ідэйна-мастацкай інтэрпрэтацыі твора вядомымі айчыннымі літаратуразнаўцамі. У 1930-я гады паводле вульгарна-сацыялагічных ацэнак В. Дунін-Марцінкевіч быў залічаны да катэгорыі рэакцыйных пісьменнікаў-прыгоннікаў, *Быліцы*… кваліфікаваліся як твор супярэчлівы і насычаны царысцкімі ілюзіямі. У артыкуле прасочана роля беларускіх даследчыкаў другой паловы XX – пачатку XXI стст. у адмаўленні прымітыўных інтэрпрэтацыйных схем вульгарызатараў. Удакладняецца значэнне *Быліцаў*… у працэсе творчай эвалюцыі аўтара і гісторыі айчыннага прыгожага пісьменства.

Ключавыя словы: творчая гісторыя, быліца, жанр падарожжа, рэцэпцыя, інтэрпрэтацыя, кампазіцыя

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Быліцы, расказы Навума буйнейшага беларускага пісьменніка сярэдзіны XIX стагоддзя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча былі завершаны ў Мінску 20 жніўня 1857 года. Пры жыцці аўтар двойчы беспаспяхова спрабаваў апублікаваць гэты твор. Частка яго тэксту ўпершыню была надрукавана Лукашам Бэндэ ў часопісе „Полымя" ў 1946 г. З усіх марцінкевічаўскіх беларускамоўных твораў пераважна інтэрпрэтацыя ідэйнага зместу *Халімона на каранацыі*, другой часткі *Быліцаў...*, выклікала дыяметральна процілеглыя ацэнкі і дыскусіі сярод даследчыкаў. З аднаго боку, твор называўся супярэчлівым, бурлескным і насычаным царысцкімі ілюзіямі; з іншага боку, яго змест, мастацкія прыёмы, характарыстыка вобразаў-персанажаў, звязаных з апісанымі падзеямі і з'явамі, абвяшчаліся антысамадзяржаўнымі і сатырычнымі. І да нашых дзён, амаль праз тры чвэрці стагоддзя пасля першапублікацыі, далейшае выяўленне спецыфікі мастацкага пошуку пісьменніка ў *Быліцах...* застаецца надзённай задачай марцінкевічазнаўства.

Быліцы... – твор шматпланавы, з выразна акрэсленай устаноўкай аўтара на мастацкі эксперымент. У ім знайшлі адлюстраванне такія значныя для тагачаснай гісторыі Расіі падзеі, як прайграная імперыяй Крымская вайна (1853–1856), каранацыя ў Маскве 7 верасня 1856 года імператара Аляксандра II, некаторыя мерапрыемствы цара-рэфарматара. Гэты твор з адчувальным грамадска-палітычным кантэкстам узнік у выніку асэнсавання аўтарам рэалій тагачаснага жыцця. Маштабнасць і актуальнасць патрыятычнай праблематыкі найперш і паўплывала на драматычныя калізіі доўгага шляху, амаль дзевяноста гадоў, *Быліцаў...* да чытача. *Быліцы...* сталі апошнім (шостым) у своеасаблівым марцінкевічаўскім цыкле беларускамоўных твораў паэтычнага эпасу. Яны не столькі пра вясковае, як «калыску беларускай літаратуры XIX стагоддзя» (Gnìlamiodaŭ, 2001, s. 16), па трапнаму выразу У. Гніламёдава, колькі прысвечаны праблеме нацыянальнай ідэнтыфікацыі землякоў-беларусаў. Найважнейшае ідэйна-мастацкае значэнне мае той факт, што твор пачынаецца з проціпастаўленняў „краю заморскага" роднай зямлі і замежнікаў землякам:

Прыгож край заморскі – дзівы там страшэнны!
Народ, кажуць людзі, разумны, пісьменны!
Мужычок багаты! – у чобатах ходзіць,
А Божая ніўка беленькі хлеб родзіць;
Усяк сабе панам – шчасліў быт дамовы!
Да не шукай сэрца – то ж народ тарговы!

Ой, нямаш зямелькі, як Літва радзона!
На лугах дыванам сцелецца зялёна
Травіца па пояс, кветкамі мігае!
А лес, вось тычынка, неба падпірае!

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

> Мужык хоць убогі, – як вол, працавіты!
> Гаруючы цяжка, рэдка калі сыты;
> Зато ў позну восень, як з ніўкаю зладзіць
> Дый святой нядзелькай на куце засядзіць,
> Яго ж маладзіца, Домна чы Усціння,
> Спражыць верашчакі, наварыць бацвіння;
> Хоць хлябок чарненькі, часам і з карою,
> Вясёл! пажывае з сваяшнай раднёю!
> (Dunìn-Marcìnkevič, 2008, s. 239).

Супрацьпастаўленне „свой – чужы" з'яўляецца дамінуючым ідэйна-мастацкім элементам твора. Такім чынам, аўтар з самага пачатку арыентаваў увагу чытачоў на стаўленне да радзімы, якое і будзе асноўным. Гэтая акалічнасць у многім абумовіла жанрававызначальныя прыкметы формы і зместу. У *Быліцах…* нацыянальная ідэя ўвасоблена не толькі „ў матэрыяле слова" (Gnìlamiodaŭ, 2001, s. 17), але і ў вобразе галоўнага героя гарадзецкага старшыны Халімона Забалотнага. Воляй аўтара ён, як прадстаўнік Беларусі, па сённяшняй тэрміналогіі, яе рэпрэзентант, накіроўваецца ў „вялікі" свет на каранацыю цара, з Гарадка пад Магілёвам у Маскву. Па сучасных дарогах маршрут складае больш за 600 км (значнае перамяшчэнне ў рэальнай геаграфічнай прасторы), што для тагачаснага беларускага селяніна, які рэдка наведваў нават павятовыя, не кажучы пра губернскія, гарады, было проста неверагодным падарожжам, у якім істотную ролю мае геаграфічны чыннік. У параўнанні з папярэднімі творамі паэтычнага эпасу (*Гапон* і *Вечарніцы* (1855), *Купала* (1856), *Шчароўскія дажынкі* і *Травіца брат-сястрыца* (1857)) у *Быліцах…* найбольш выразна выявіўся пераход у творчасці пісьменніка ад сентыментальна-рамантычнай эстэтыкі да рэалістычнай.

Такім чынам, твор займае асаблівае месца ў беларускамоўнай творчай спадчыне пісьменніка і гісторыі роднай літаратуры сярэдзіны XIX стагоддзя.

Напярэдадні скасавання прыгоннай залежнасці ў Расіі многіх неабыякавых адукаваных падданых імперыі хвалявала галоўнае пытанне: *Што трэба народу?* У агітацыйным артыкуле з такой назвай Мікалай Агароў сцвярджаў у 1861 годзе, што чатыры гады пісалі і перапісвалі маніфест, затым аб'явілі народу свабоду і пачалі служыць у цэрквах малебны – „маліцца богу за цара, ды за волю, ды за сваё будучае шчасце" (Ogarev, 1988, s. 68). Прызнаючы, што выдаўцы *Колокола* ўскладалі пэўныя надзеі на ўрад, пісьменнік з сумам канстатаваў:

> Нічому народ не вучылі. Грошы, што збіраюць на народнае навучанне, раскідаюць на царскія канюшні і псярні, на чыноўнікаў і непатрэбнае войска, якое страляла б па народу. Разумеюць самі, што так быць нельга, што з такім іскарыёцтвам і народ загубіш, і царства згубіш, і саміх сябе ні з чым пакінеш (Ogarev, 1988, s. 68).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Падобныя ідэі потым амаль даслоўна адгукнуцца ў *Мужыцкай праўдзе* Кастуся Каліноўскага. Звернемся да фактаў, звязаных з творчай гісторыяй *Быліцаў*…. Твор быў напісаны пасля публікацыі вядомых і значных узораў жанру „падарожжа" ў шматмоўнай літаратуры Беларусі сярэдзіны XIX ст. Прыгадаем *Wędrówki po moich niegdyś okolicach* (*Вандроўкі па маіх былых ваколіцах*) (1853) Уладзіслава Сыракомлі, *Путешествие по Полесью и Белорусскому краю* (*Падарожжа па Палессі і беларускім краі*) (1853–1855) Паўла Шпілеўскага.

Каб пацвердзіць папулярнасць выкарыстання гэтай жанравай формы ў канкрэтны гісторыка-літаратурны перыяд, варта згадаць і *Dziennik podróży do Tatrów* (*Дзённік падарожжа ў Татры*) Севярына Гашчынскага. Пачынаючы з 1834 г., ён друкаваўся фрагментамі ў розных перыядычных выданнях і ўпершыню выйшаў асобнай кнігай у Пецярбургу ў 1853 г. Гэты твор лічыцца першай значнай працай, прысвечанай прыродзе і фальклору Падгалля (горны рэгіён на поўдні Польшчы), гуральскае насельніцтва якога захавала этнаграфічныя адметнасці і мела багатую народную культуру. Шматлікія перадрукі тэксту *Дзённіка*… у розных тагачасных перыядычных выданнях сведчаць пра вялікую папулярнасць закранутай С. Гашчынскім рэгіянальнай тэматыкі.

Спашлемся і на аўтарытэтнае сведчанне У. Сыракомлі, які так пачаў *Дарожны дзённік 1856 года*:

> Цяперашні год, хоць і халодны, без цяпла, значна багацейшы, чым мінулы, на падарожжы літаратараў. Качкоўскі, Сяменскі, Вільконскі ездзілі на воды Зальцбурга, Трыплін з Варшавы і Адам Плуг (Антоні Пяткевіч) з Падолля прыехалі пазнаёміцца са сталіцай Літвы, Ян са Слівіна (Адам Кіркор – І.З.) ажыццявіў вучонае падарожжа па роднай зямлі, словам, узнікла і ў нас амаль невядомая дагэтуль мода падарожнічаць і запісваць назіранні для азнаямлення чытачоў з усёй краіны. Імкненне гэтае, выкліканае жыццёвай неабходнасцю, заслугоўвае ўсялякай ухвалы (Syrakomlia, 2011, s. 432).

У 1856 годзе ў Мінск прыязджаў згаданы А. Плуг, які ў атмасферы „сардэчнай гасціннасці" (Plug, 2010, s. 175) зведаў хлебасольства ў доме Марцінкевіча, якому прысвяціў прывітальны верш на польскай мове *Да В. Марцінкевіча, аўтара твораў на беларускай гаворцы* (Plug, 2010, s.151–152). Ён горача вітаў беларускамоўную творчасць аўтара *Ідыліі*, выказаў упэўненасць у бліскучых перспектывах развіцця літаратуры на „сялянскай" мове. Але ў асобе госця Марцінкевіч меў не толькі апалагета сваіх літаратурных ініцыятыў, але і дарадцу. А. Плуг пісаў:

> Дагэтуль пан Марцінкевіч яшчэ не ўсталяваў свайго погляду, *не стварыў для сябе такога жанру* (курсіў наш – І. З.), у якім побач з разумовым заняткам прасталюдзіны знайшлі б і святую навуку. У ранейшых сваіх творах, малюючы то гулянку ў карчме, то штогадовыя святы, як Купала, Дажынкі і г. д., аўтар, мяркую, больш думаў аб адукаваных сваіх чытачах, чым аб простанароддзі, і для іх, а не для народа маляваў народ (Plug, 2010, s. 168).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

А. Плуг таксама рэкамендаваў Марцінкевічу „не адно зло" маляваць, а часцей паказваць „добрыя ўзоры", пісаць прозай, а не вершам, які раіў у любым выпадку старанна шліфаваць для „гладкасці і шляхетнасці", г. зн. павышаць паэтычную тэхніку, а таксама настойліва пераконваў пазбягаць „залішняй грубасці, якая вельмі лёгка пераходзіць у трывіяльнасць" (Plug, 2010, s. 169). Як бачым, нягледзячы на дабразычлівасць і сяброўскія адносіны, гэтыя „настаўленні" мелі прынцыповы характар.

Вядома таксама, што аўтар *Гапона* высока цаніў меркаванне госця, працягваў з ім ліставанне, дзяліўся творчымі планамі, верагодна прасіў у яго парадаў. А. Плуг з аптымізмам пісаў:

> Не сумняваемся, што з часам пан Марцінкевіч знойдзе адпаведную дарогу і што кніжкі яго, разышоўшыся па літоўскіх валасцях, выдатна паўплываюць на папраўленне звычаяў люду, і пацвярджэнне маіх надзей бачу ў апошнім яго лісце да мяне, дзе паведамляе мне, што падрыхтаваў да друку *Быліцы і расказы Навума Прыгаворкі*, першы з якіх пад назвай *Злая жонка* мае мэту паказаць, якой згубай нават для найлепшага селяніна з'яўляецца зласлівая гаспадыня (Plug, 2010, s. 168).

Трэба адзначыць, што ў надрукаваным у 1858 г. у варшаўскай газеце „Kronika wiadomości krajowych i zagranicznych" краязнаўчым нарысе А. Плуга *...Колькі ўражанняў з вандровак па Літве* зафіксавана першая па часе згадка новага марцінкевічаўскага твора ў друку. Варта таксама прыгадаць, што А. Плуг быў аўтарам беларускага апавядання *Кручаная баба* (1849). Яно стала літаратурнай апрацоўкай фальклорнай крыніцы, казкі-анекдота пра тое, як муж правучыў легкаверную жонку, якая „ніякага сакрэту, крый божа, утрымаць не магла" (Maĺdzis, 2013, s. 606). Пазней тэкст казкі трапіў у фальклорныя зборнікі Еўдакіма Раманава, Паўла Шэйна, Міхала Федароўскага і інш.

Складаным акалічнасцям, якія папярэднічалі першай публікацыі тэксту *Быліцаў, расказаў Навума*, прысвечаны артыкул Генадзя Кісялёва *Паслухайце, браткі, Навума старога* (Kisialioŭ, 1994). З яго вынікае, што першым даследчыкам *Быліцаў...* стаў прафесар Іван Замоцін. У канцы 1929 г. ён падрыхтаваў да публікацыі артыкул *Аб новых рукапісах В. Дуніна-Марцінкевіча*, які павінен быў быць надрукаваны ў наступным годзе. Аднак у гэты перыяд у БССР распачалася барацьба з т. зв. беларускім нацыянал-дэмакратызмам. У выніку яе, па сцверджанні Антона Адамовіча, „дыскрымінаваная-ж адно часткова літаратура XIX–XX вв. пачала разглядацца ўсяго ў якасці аб'екту асуджэньня як «буржуазна-нацыяналістычная», а зь ёю разам – і ўсе літаратураведы, што калі-небудзь вывучалі яе з пазытыўнага гледзішча" (Adamovìč, 2005, s. 1136), былі рэпрэсіраваны, у тым ліку і „асьцярожны праф. Замоцін". Дзякуючы збегу акалічнасцей, карэктурныя адбіткі артыкула *Аб новых рукапісах В. Дуніна-Марцінкевіча* захаваліся і ўпершыню ён быў апублікаваны ў 1991 г. З тэкста артыкула вынікае, што „асцярожнасць" даследчыка праявілася ў выкарыстанні некаторых насаджáных тады сацыялагічных трафарэтных схем

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

аналізу. Яны звязаны з выяўленнем „псіхаідэалагічнай накіраванасці" аўтара мастацкіх твораў, іх „класавай" лексікі і вобразнасці, адсутнасці „малюнкаў звычайнай штодзённай працы", насычанасці карцінамі „святочнай гульні", „сентыментальнасці" ў паказе сямейных адносін, набожнасці, забабоннасці герояў і інш. Разам з тым І. Замоцін не пакінуў па-за ўвагай сакавітую народную мову *Быліцаў*..., некаторыя дэмакратычныя настроі, крытычныя і іранічныя адносіны „да чыноўніцкіх бюракратычных парадкаў", увогуле дабрадушную іронію і „наіўна-ліберальныя разважанні Забалотнага", праз што *Халімон на каранацыі* і не быў прапушчаны цэнзурай да друку.

Падсумоўваючы, І. Замоцін фармулюе тры станоўчыя вынікі выяўлення новых рукапісаў пісьменніка: значнае павелічэнне яго творчай спадчыны, багаты матэрыял для вывучэння мовы, і асобна „мастацкага стылю". Аднак асноўны пункт ляжыць не ў плоскасці гісторыка-літаратурнай ці эстэтычнай:

> Нарэшце – і гэта галоўнае – яны даюць падставу больш дакладна выявіць класавы твар пісьменніка. Гэта апошняе пытанне і было асноўнай тэмай майго нарыса, паколькі мяне цікавіла ўласна сацыяльна-класавая пазіцыя ў творчасці Дуніна-Марцінкевіча (Zamocin, 1991, s. 229).

Трэба пагадзіцца з вывадам Уладзіміра Конана, што ў артыкуле *Аб новых рукапісах В. Дуніна-Марцінкевіча* назіраюцца „відавочныя ўступкі аўтара вульгарна-сацыялагічнай «класавай ідэалогіі»" (Konan, 1991, s. 27). Адзначым, што да сённяшняга дня захавалася рукапісная копія тэксту *Быліцаў, расказаў Навума*, знятая прафесарам І. Замоціным у 20-я гг. XX ст., а арыгінал верагодна загінуў у час масавых рэпрэсій 30-х гадоў ці ў віхуры вайны.

У 1933 г. у вучэбным выданні *Літаратура. Хрэстаматыя для сярэдняй школы. Частка 1 (шосты год). Дарэвалюцыйная літаратура* Л. Бэндэ назваў *Халімона на каранацыі* (без аналізу тэксту) у пераліку твораў В. Дуніна-Марцінкевіча. Творчасці пісьменніка была дадзена адпаведная часу вульгарна-сацыялагічная ацэнка. Назваўшы Марцінкевіча пладавітым беларускім памешчыцкім пісьменнікам і рэакцыянерам, ідэолагам рэакцыйных прыгоннікаў-памешчыкаў і ярым абаронцам іх інтарэсаў, Л. Бэндэ так ахарактарызаваў яго творчы даробак:

> Творчасць Марцынкевіча, не гледзячы на адносна вялікую яе колькасць, характарызуецца невялікім, мізэрным кругам праблем, ідэйнай і фармальнай аднастайнасцю. Адзінае, што ў некаторай ступені ажыўляе яе – гэта наяўнасць розных жанраў: камедыі, апавяданні, вершы, паэмы. Аднак вартасць гэтай жанравай рознастайнасці зніжаецца аднастайнасцю тэматыкі, ідэйных праблем і фармальных прыёмаў (Bèndè, 1933, s. 18–19).

У той час крытык лічыў значную па аб'ёму творчую спадчыну аўтара *Ідыліі* хоць і багатай у жанравым плане, але малазначнай у ідэйна-мастацкіх адносі-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

нах. Ён непасрэдна звязваў асаблівасці творчасці пісьменніка з яго сацыяльным (класавым, па тагачаснай тэрміналогіі) паходжаннем, эканамічнымі фактарамі і матэрыяльнымі ўмовамі жыцця без уліку гісторыка-культурнай спецыфікі эпохі.

Яшчэ далей у катэгарычнасці сваіх сацыялагічных ацэнак пайшоў Мікола Пятровіч, тагачасны аспірант Інстытута Літаратуры і Мастацтва Беларускай Акадэміі Навук. Ён меў доступ да тэксту неапублікаваных яшчэ *Быліцаў, расказаў Навума*, пераказаў іх змест і нават прывёў шэраг цытат для пацвярджэння слушнасці сваіх крытычных вывадаў. Паводле М. Пятровіча, у першай быліцы *Злая жонка* заключана мараль: „жонка ў сям'і павінна ва ўсім падпарадкавацца мужу", яе ідэал „у пакорлівасці і працавітасці". У другой быліцы *Халімон на каранацыі* „прападведнік прыгону, дамастроевец у сямейных пытаннях, клерыкал Марцынкевіч аказаўся ярым царыстам", бо „цар у сваёй дзяржаве – гэта добры бацька сваіх падданых" (Piatrovič, 1934, s. 52). М. Пятровіч, акумулюючы вывады назіранні папярэднікаў (Максіма Гарэцкага, І. Замоціна і Л. Бэндэ), скрупулёзна пералічвае недахопы мастацкіх твораў пісьменніка. А яны, на думку аспіранта-вульгарызатара, заключаюцца ў наступным:

- рахманыя і пакорлівыя героі;
- іх слязлівасць, як прыкмета „сантыменталізма, як зброі барацьбы за свае інтарэсы";
- схематычнасць і аднатыпнасць вобразаў герояў і гераінь, „якія, як дзве каплі вады, падобны адна на другую" (Piatrovič, 1934, s. 55);
- „надзвычайная беднасць, убогасць фарб у абрысоўцы персанажа";
- кампазіцыйная прымітыўнасць і выкарыстанне „рэакцыйнага фальклору" (абрадаў, забабонаў і інш);
- пейзажныя замалёўкі, якія выклікаюць „настрой лагоднасці, задаволенасці";
- ужыванне памяншальна-ласкальнай лексікі;
- узвелічэнне радавітага шляхецтва і інш.

У выніку М. Пятровіч фармулюе мэту і абумоўленыя тагачасным сацыяльным антаганізмам творчыя намеры пісьменніка:

> Галоўная ідэя, якой падпарадкоўваецца ўвесь змест разгледжанай творчасці Марцынкевіча, затрымаць разбурэнне прыгоннай гаспадаркі, згладзіць класавыя супярэчнасці паміж памешчыкам і селянінам, затушыць разгараўшыйся пажар класавай барацьбы і выратаваць памешчыка (Piatrovič, 1934, s. 53–54).

Паказальна, што, па меркаванні аспіранта, ворагі, цар і памешчыкі-прыгоннікі, былі не толькі ў мінулым, ёсць яны і ў сучаснасці, калі нібыта няўхільна абвастралася класавая барацьба:

> Выкрываючы выразна класава-прыгонніцкі характар творчасці пісьменніка, мы наносім зніштажаючы ўдар нацыянал-дэмакратам – апяваўцам самабытнасці Белару-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

> сі, дзе нібыта не было і няма класавай барацьбы, прапаведнікам „бесстароннасці", „беспартыйнасці" навукі і мастацтва… (Piatrovič, 1934, s. 57).

„Класавыя" трактоўкі творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча ў сярэдзіне 30-х гадоў мінулага стагоддзя былі ўведзены ў школьны навучальны працэс. У выданні *Літаратура. Хрэстаматыя для сярэдняй школы. Восьмы год навучання. Дарэвалюцыйная літаратура* (1934), укладальнікам якога быў Алесь Кучар і дзе быў змешчаны артыкул М. Пятровіча, такім чынам рэалізоўваліся тагачасныя „канцэптуальныя" падыходы да фарміравання светапогляду школьных навучэнцаў. Прынятая і замацаваная ў той перыяд інтэрпрэтацыя творчасці Марцінкевіча пазней дзясяцігоддзі замінала адэкватнаму асэнсаванню яе ў гісторыі айчыннага пісьменства.

Адам Бабарэка без ценю асуджэння згадваў у 1927 г. „літаратуру Марцінкевічавага кругабегу", якой даў найменне „асьветызм другой траціны XIX ст." (Babarèka, 2011, s. 429). „Асветызм" ці асветніцтва быў ідэйна-мастацкай дамінантай усёй беларускамоўнай творчасці Марцінкевіча. Але крэатыўны тэрмін крытыка „Узвышша" ўсяго праз некалькі гадоў быў адкінуты. З класавай псіхаідэалогіі М. Пятровіча вынікае:

> Зусім зразумела, якой хоча „асветы" Дунін-Марцынкевіч. Гэта тая-ж „асвета", што і сам пісьменнік сеяў сярод сялян – гэта „асвета" прыгонніка, „асвета" мракабесія, асвета лёкайства, рабалепія (Piatrovič, 1934, s. 53).

Так прамалінейна тлумачацца змест і ідэйная скіраванасць мастацкіх твораў мінулай эпохі з пазіцый ідэалагічных, палітыка-эканамічных ўяўленняў пазнейшай пары. Вульгарна-сацыялагічныя ацэнкі былі замацаваны ў *Праграме па беларускай літаратуры для 8, 9 і 10 класаў сярэдняй школы і педагагічных тэхнікумаў* (1935). У ёй творчасць Марцінкевіча была залічана да катэгорыі „Літаратуры прыгонніцкага памешчыцтва", сам пісьменнік кваліфікаваўся „як прадстаўнік рэакцыйна-памешчыцкага сантыменталізма" (Prahrama pa bielaruskaj litaratury…, 1935, s. 6).

Як адзначалася, у далейшым карэктурныя адбіткі артыкула І. Замоціна *Аб новых рукапісах В. Дуніна-Марцінкевіча*, праведзеныя даследчыкам тэксталагічнае апісанне і аналіз рукапісаў пісьменніка трапілі ў рукі Л. Бэндэ і былі спецыфічным чынам выкарыстаны для часопіснай публікацыі ў „Полымі" (1946 г.). „Фактычна Бэндэ падаў цэлыя кавалкі з артыкула Замоціна без двукоссяў і ўказання крыніцы" (Kisialioŭ, 1994, s. 109) – канстатаваў Г. Кісялёў. Імя арыштаванага ў 1938 г. „удзельніка контррэвалюцыйнай арганізацыі" І. Замоціна, які памёр у 1942 г. у турэмным шпіталі, эпатажны крытык не згадаў. А пра акалічнасці выяўлення марцінкевічаўскіх недрукаваных твораў ён напісаў сцісла, без асаблівай канкрэтызацыі:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

> Арыгіналы В. Дуніна-Марцінкевіча да Айчыннай вайны захоўваліся ў архіве Акадэміі навук БССР і, мабыць, загінулі… (Bèndè, 1946, s. 92–93).

Г. Кісялёвым устаноўлены факт „даслоўнага" выкарыстання Л. Бэндэ фрагменту тэксту з артыкула І. Замоціна (Kisialioŭ, 1988, s. 51).

У публікацыі Л. Бэндэ, прымеркаванай да 100-годдзя першага выступлення В. Дуніна-Марцінкевіча ў друку, амаль адсутнічаюць вульгарна-сацыялагічныя закіды ў адрас пісьменніка. Гэта тлумачыцца ўплывам пэўных рэвізіянісцка-апалагетычных тэндэнцый, якія праявілі сябе ў беларускім літаратуразнаўстве ў першыя пасляваенныя гады. На гэтай хвалі пісьменнік, наадварот, прызнаецца пачынальнікам новага этапу ў гісторыі беларускай драматургіі і тэатра, называецца пладавітым аўтарам, які выступаў з творамі ў розных жанрах, што „ўвайшлі ў фонд беларускай класічнай літаратуры" (Bèndè, 1946, s. 91), творцам, галоўным героем якога быў беларускі селянін. Ён у *Быліцах, раскажах Навума* паказаны як носьбіт высокіх маральных якасцей і патрыёт роднай зямлі, улюбёны ў Маскву, як і сам пісьменнік, майстар адлюстравання сялянскага побыту, „спелы і сталы паэт, які досыць свабодна валодае дасканалымі для свайго часу паэтычнымі прыёмамі" (Bèndè, 1946, s. 92). Публікатар таксама падкрэсліў народалюбства Марцінкевіча і яго асветніцкія памкненні. Відавочна, што такія пафасныя ацэнкі не карэлявалі як з крытычнымі „класавымі" характарыстыкамі І. Замоціна, так і ранейшымі ацэнкамі самога Л. Бэндэ. Істотна, што галоўны замоцінскі вывад, „пра класавы твар пісьменніка", паўтораны не быў.

Такім чынам, у публікацыі Л. Бэндэ, які ў пасляваенны перыяд „спрабаваў перабудавацца" (Г. Кісялёў), на аснове новых тэкстаў была зроблена спроба своеасаблівай „сацыяльна-класавай" рэабілітацыі Марцінкевіча. Пераацэнка творчай спадчыны пісьменніка ў першыя пасляваенныя гады паступова знаходзіла падтрымку. У канцы мая – пачатку чэрвеня 1948 г. Прэзідыум Акадэміі навук БССР правёў спецыяльную сесію аддзялення грамадскіх навук. На ёй абмяркоўваліся розныя аспекты гісторыі грамадскай думкі ў Беларусі і, у прыватнасці, асаблівасці светапогляду і дзейнасць Скарыны, Каліноўскага і Багушэвіча, а таксама ацэнкі іх творчай спадчыны. З дакладам, прысвечаным жыццю і творчасці Францішка Багушэвіча, выступіў Васіль Барысенка. Ён, назваўшы пісьменніка паэтам-дэмакратам і пачынальнікам дэмакратычнага напрамку ў беларускай літаратуры, аднак рэзка проціпаставіў яму В. Дуніна-Марцінкевіча як прадстаўніка дваранска-сентыментальнага напрамку ў гісторыі айчыннага пісьменства. Такая трактоўка, не выклікаўшы пярэчанняў і спрэчак, была прынята як ідэалагічна абгрунтаваная і належным чынам аргументаваная. У далейшым на працягу некалькіх дзясяцігоддзяў яна набыла характар дырэктыўнай, аднак былі і такія даследчыкі, якія з ёю не ва ўсім пагадзіліся.

У тым жа 1948 г. у Інстытуце літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР аўтарскім калектывам (В. Барысенка, Міхась Ларчанка, Навум Перкін і інш.)

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

быў падрыхтаваны падручнік па гісторыі беларускай літаратуры для VIII класа сярэдняй школы. У „Весцях Акадэміі Навук БССР" паведамлялася:

> … Шмат новага ўнесена ў ацэнку культурнай спадчыны *Г. Скарыны* і буйнейшага прадстаўніка сантыментальна-рамантычнага напрамку ў беларускай літаратуры ў XIX стагоддзі *Дуніна-Марцынкевіча*. У падручніку вялікая ўвага звернута на творчасць беларускага паэта-дэмакрата *Ф. Багушэвіча*. Дадзена таксама новая ацэнка газеце „Наша ніва" (Chronika, 1948, s. 127).

Падручнік для VIII класа пабачыў свет у 1949 г. Нельга адмаўляць, што ў ім, нягледзячы на сацыялагізаваную перыядызацыю, сапраўды назіраецца сістэмнае бачанне гісторыка-літаратурнага працэсу. Пра жыццё і творчасць Марцінкевіча пісаў згаданы В. Барысенка. Ён, у „злагоджанай" форме паўтарыўшы большасць крытычных закідаў у адрас пісьменніка, агучаных М. Пятровічам, істотна змяніў ацэначныя акцэнты. Аўтар *Ідыліі* быў абвешчаны пісьменнікам-сентыменталістам, які імкнуўся выклікаць спачуванне да селяніна, галоўнага героя сваіх твораў. Спаслаўшыся на меркаванні Максіма Багдановіча і Янкі Купалы, В. Барысенка стрымана падсумаваў: „Зусім бясспрэчна, што творчасць Дуніна-Марцінкевіча ўнесла пэўны ўклад у развіццё беларускай літаратуры" (Belaruskaâ lìtaratura, 1949, s. 76). У падручніку аналізаваліся марцінкевічаўскія *Ідылія*, *Гапон*, *Пінская шляхта* і *Залёты*, а на тэксце апублікаваных незадоўга перад гэтым *Быліцаў, расказаў Навума* ўвага не акцэнтавалася.

У 1950 г. Інстытутам мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР пад рэд. Юльяна Пшыркова быў перавыдадзены зборнік тэкстаў *Беларуская літаратура XIX стагоддзя* (1-е выданне пад рэдакцыяй Янкі Купалы 1940 г.). У другое выданне былі ўключаны і *Быліцы, расказы Навума* Марцінкевіча, пасля чаго тэкст твора стаў даступны і для масавага чытача. Сам жа пісьменнік характарызаваўся паводле ранейшых сацыялагічных установак:

> Па свайму светапогляду Д.-Марцінкевіч належыць да пісьменнікаў ліберальна-дваранскага напрамку. У яго сентыментальных вершаваных апавяданнях і паэмах дарэформеннай пары (*Вечарніцы*, *Шчароўскія дажынкі*, *Гапон* і інш.) выяўляецца ідэалізацыя феадальна-патрыярхальнага жыцця, пропаведзь класавага міру, культ старасветчыны, пачуццёвасць, пераходзячая ў слязлівасць і г. д. (Pšyrkoŭ, 1950, s. 75).

Да пачатку 50-х гадоў XX ст. ўжо завяршыўся пераважна сацыяльна абумоўлены працэс „класавай" дыферэнцыяцыі айчынных літаратараў XIX ст. Адзначым, што два складальнікі гэтага зборніка В. Барысенка і М. Ларчанка пазней разыдуцца ў ацэнках ідэйнай скіраванасці і мастацкай вартасці *Быліцаў*…. В. Барысенка, аддаўшы перавагу *Гапону*, не ўключыў тэкст „неадназначнага" твора ў складзеную ім хрэстаматыю для педагагічных вучылішчаў *Беларуская літаратура (Дакастрычніцкі перыяд)* (1953).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

У 1955 г. пабачыла свет манаграфія *В.І. Дунін-Марцінкевіч* Сцяпана Майхровіча. Даследчык адзначыў, што Марцінкевіч „заставаўся памяркоўным у соцыяльных пытаннях", але разам з тым у *Быліцах*... паказаў сябе аўтарам з „глыбокім спачуваннем да загнанага люду" (Majchrovič, 1955, s. 125). С. Майхровіч, не адмаўляючы „ліберальна-дваранскага светапогляду" пісьменніка, першым прапанаваў інтэрпрэтацыю *Халімона на каранацыі* як твора-алегорыі ў рэпрэзентатыўным паэтычным эпасе Марцінкевіча:

> Для чытача не была таямніцай іронія аўтара, якую ён часта ўжываў, як замаскаваную форму іншасказальнасці. Ясна было, што <…> аўтар асцярожна, з ліберальных пазіцый, разважаў аб „убогім, рэдка калі сытым" мужыку, ды к таму-ж заўсёды яшчэ вельмі „задаволеным"… (Majchrovič, 1955, s. 127).

Менавіта вострай іроніяй і жартоўна-прыгодніцкім каларытам С. Майхровіч імкнуўся пацвердзіць „сатырычны тон" *Халімона на каранацыі*. Даследчык быў упэўнены, што галоўны герой твора „не падзяляе манархічных ілюзій" і з „едкім сарказмам" ставіцца да „камедыі царашанавання", а аўтар такім чынам „вельмі востра высмейвае паноў-ліберaлаў" (Majchrovič, 1955, s. 148). Прапанаваўшы такую трактоўку, якая была абумоўлена агульнай тэндэнцыяй у паслясталінскі перыяд канчаткова адмовіцца ад вульгарна-сацыялагічных схем, С. Майхровіч з пункту гледжання логікі сваіх доказаў выглядаў не зусім пераканаўчым. Яго спроба праз аналіз ідэйна-мастацкіх матываў і вобразаў *Халімона на каранацыі* паказаць Марцінкевіча ўжо ў 50-я гады XIX ст. у іпастасі пісьменніка-сатырыка, якім ён праявіў сябе значна пазней, не стасуецца з творчымі задачамі аўтара *Ідыліі* і *Гапона*. У *Халімоне*... паказваецца, што пануючы ў Расіі грамадскі лад у прынцыпе варожы беларускаму селяніну, як носьбіту народнага светаразумення. Але аўтар меў на мэце не крытыку, асабліва палітычную, а адлюстраванне сапраўднага народнага погляду на рэчаіснасць, звязанага з марцінкевічаўскімі ўяўленнямі пра дабро і зло.

Тым не менш С. Майхровіч паслядоўна прытрымліваўся ўласнай інтэрпрэтацыі ідэйнага зместу *Халімона на каранацыі*. Ён двойчы паўтарыў яе, з нязначнымі ўдакладненнямі, у *Нарысах беларускай літаратуры XIX стагоддзя* (1-е выд. 1957, 2-е „папраўленае" – 1959). Даследчык бачыў у творы В. Дуніна-Марцінкевіча крытыку саміх палітычных асноў самадзяржаўнага ладу:

> Натуральна, уся гэта камедыя каранацыі, з яе ілжэнародным, казённым „патрыятызмам" нічога, акрамя іроніі і вострага сатырычнага пачуцця, выклікаць у Халімона не магла. Не дзіва, што кожны, нават самы, здавалася б, дробны эпізод, звязаны з каранацыяй, знішчальна высмейваецца, і Забалотны каменя на камені не пакідае ад уяўнай святасці і ўрачыстасці ўсёй гэтай „кароннай выдумкі". Нізкую цану, відаць, паклаў Халімон Забалотны „свайму" царку, бо ніякай надзеі на яго не ўскладаў. Самае большае, што мог ён зрабіць, дык гэта – пасмяяцца з „царка" (Majchrovič, 1957, s. 119).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Выяўляючы асаблівасці літаратурна-мастацкага працэсу сярэдзіны XIX ст., наяўнасць такіх кардынальных зрухаў у *Быліцах*... у параўнанні з папярэднімі марцінкевічаўскімі творамі даследчык паслядоўна імкнуўся сцвердзіць і адпаведным чынам абгрунтаваць.

Аднак проста немагчыма ўявіць, каб у гістарычных умовах існавання самадзяржаўнай Расійскай імперыі напярэдадні скасавання прыгону правінцыйны пісьменнік, якім быў насамрэч В. Дунін-Марцінкевіч, свядома наважыўся стварыць мастацкі вобраз селяніна, своеасаблівага нігіліста, які „ніякай надзеі на яго (добрага цара – І. З.) не ўскладаў". Вядома, што гэтае сцверджанне не адпавядае фактам рэчаіснасці, бо напярэдадні прыезду імператара Аляксандра II у так званы Паўночна-Заходні край у 1858 годзе на лібералізм новага цара ўскладалі надзеі многія нашы адукаваныя землякі. Ускладаў іх і сам пісьменнік, калі вуснамі свайго персанажа выказаў пажаданне Халімона ад імя ўсяе Беларусі цару:

Яму б са слязінай у ногі пакланіўся,
Прасіў да маліў бы, вось пакуль дабіўся,
Штоб над мужычкамі шчыру меў апеку,
Вялеў справіць розум цёмну чалавеку,
Штоб дзетачак нашых чытаць навучылі,
Штоб Бога па ксёнжцы за цара малілі.
І панкі б хацелі разумных мець людзі,
Да чакаюць, яка царска воля будзі.
(Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 267).

Тут, безумоўна, не парадыйнае штосьці, а рэальнае жаданне аўтара. Дарэчы, Марцінкевіч прысутнічаў сярод запрошаных на сустрэчы з Мінскім праваслаўным архібіскупам Міхалам Галубовічам, які меў асабістую аўдыенцыю ў імператара Аляксандра II 5 верасня 1858 г. у Мінску.

В. Дунін-Марцінкевіч бачыў галоўнае краёвае зло ў хцівасці паноў і ў яўрэях-карчмарах:

Да за грэхі людзей сумеў Бог скараці,
Вось панам ахвоту даў карчмы стаўляці,
Яны ў карчмах жыдоў, наліха, садзілі,
Штоб нас абдзіралі, мужыцку кроў пілі!
(Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 240).

Аўтар *Быліцаў*... відавочна падтрымліваў рэфарматарскую палітыку ўрада Аляксандра II у яўрэйскім пытанні:

Аб'явіў цар указ з карчом жыдоў гнаці,
Да не тут-та была! ўзялі хітраваці,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Яны там харчэўні быццам залажылі,
У карчмах шынкарак сваіх пасадзілі;
Толькі цяпер ўдвоя мужык плаціць чарку,
Бачыш, жыду трэба заплаціць шынкарку,
Дый і ацэсару трэба пакланіцца,
Рука руку мые – чаго тут дзівіцца?!
Ой, штоб эты п'яўкі кроў нашу не ссалі,
У нашай зямельцы бяды б мы не зналі!
(Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 240).

Тут відавочна ідзе гаворка аб цяжкасцях выканання зацверджанага царом указа ад 5 снежня 1855 г., паводле якога ў рысе аселасці між іншага забаранялася яўрэям жыць у дамах, у якіх праводзіўся „распівачны" продаж, не дазвалялася таксама трымаць бровары без дазволу ўрада.

Пра беднасць і татальнае п'янства, у якое былі ўцягнуты і жанчыны („Жонка тры дні з дуру п'ець…"), а таксама чаканне сялянамі вызвалення ад прыгону ідзе гаворка ў ананімным вершы *Вясна гола перапала*: „Хоць халодна, хоць галодна, / Холад, голад ніпачом! / Эх, каб толькі нам свабодна! / На свабодзе аджывём!" (Maĺdzis, 2013, s. 513). Многіх тагачасных ананімных аўтараў не пакідала вера ў лепшую будучыню сялянства. Напрыклад, прыгонныя героі папулярнай *Гутаркі Данілы са Сцяпанам* ненавідзяць за ранейшыя здзекі крывадушных паноў, якія нібыта цяпер ілгуць цару, гатоваму неадкладна даць свабоду мужыкам. Твор адлюстроўвае царысцкія ілюзіі, заключаныя ў своеасаблівым рэзюме: „Як Бог і цар хоча, мусіць, так і трэба" [Maĺdzis, 2013, s. 615).

Дарэчы, пісьменнік-гумарыст Альберт Паўловіч, які ў 1925 г. апублікаваў адзін са спісаў *Гутаркі [Данілы са Сцяпанам]*, быў перакананы, што аўтарам твора быў В. Дунін-Марцінкевіч. У апублікаваным А. Паўловічам тэксце твора ёсць такія радкі:

Дай боже цару нашему здароўя
Нехай нашей доли скоштуюць панове
Нехай яго родзину бог у шчасци годуе
Што іон нашым брацям вольносць падаруе
А тым нашым панам што з нас скуру драли
Дай боже штоб яны на сабе того дазнали.
(Paŭlovič, 1925, s. 174–175).

Ідэйны змест гэтага фрагмента пацвярджае наяўнасць у невядомага аўтара, як і ў цэлым у сялянскім асяроддзі, царысцкіх ілюзій. Аднак у аспекце сацыяльнага антаганізму ён прынцыпова не карэлюе з пафасам творчасці Марцінкевіча, які ў *Лісце у рэдакцыю Gazety Polskiej* (1861) прызнаваўся, што „назіраючы згубныя намаганні адштурхнуць ад нас народ (падкр. намі – І. З.), вырашыў я праз творы

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

на ягонай гаворцы <…> заахвоціць яго неяк да асветы і ўдасканаліць маральна" (Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 393). Няма сумнення, што Марцінкевіч быў знаёмы і з ананімным вершам *Вясна гола перапала*, і з *Гутаркай Данілы са Сцяпанам*, але аўтарам гэтых твораў ён быць наўрад ці мог. Напісаныя на беларускай мове, яны кардынальна супярэчылі яго светапоглядным устаноўкам. Пазіцыяныючы сябе піянерам у беларускамоўнай творчасці, што было падтрымана ў рэцэнзіях У. Сыракомлі, аўтар *Гапона* мог ставіцца да падобных твораў, хутчэй, як да інвазіўных, заразлівых.

Улічваючы радкі з марцінкевічаўскага твора „І панкі б хацелі разумных мець людзі, / Да чакаюць, яка царска воля будзі", можна дапусціць, што *Халімон на каранацыі* стаў своеасаблівай рэакцыяй пісьменніка на інвектыўны, антыпанскі пафас *Гутаркі Данілы са Сцяпанам*. Падобную творчую гісторыю мае разлічаны на шляхецкую аўдыторыю абразок Гераніма Марцінкевіча *Адвячорак. Аказія ў карчме пад Фальковічамі* (1858). Гэты твор стаў мастацкім рэагаваннем на дыскусіі аб скасаванні прыгону. Аўтар імкнуўся аслабіць уражанне ад ананімнага верша *Вясна гола перапала*, у якім гаварылася пра вызваленне сялян і сацыяльную роўнасць іх з панамі.

Пасля манаграфіі С. Майхровіча з'явілася даследаванне *Францішак Багушэвіч і праблема рэалізма ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя* (1957) В. Барысенкі. Аўтар, па сутнасці, праігнараваў інтэрпрэтацыю папярэдніка, больш акцэнтаваў увагу на ідэалагічных недахопах мастацкага метаду пісьменніка, якія найперш заключаліся ў адлюстраванні ўмоўна ідылічных карцін жыцця прыгоннага сялянства:

> Марцінкевіч пазбягаў маляваць цёмныя, адмоўныя бакі сялянскага быту, галечу і прыніжанасць прыгоннай вёскі. Яны або зусім выпадалі з поля яго зроку або падаваліся ў прыфарбаваным выглядзе. Тыповымі і паказальнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца бытавыя малюнкі ў *Быліцах* Марцінкевіча, дзе карціны сялянскай беднасці як-бы нейтралізуюцца ідылічнымі карцінамі „бесклапотнага", вясёлага і шчаслівага жыцця сялянскай беднаты (Barysenka, 1957, s. 95).

На думку даследчыка, гэта замінала пісьменніку „праўдзіва і глыбока" адлюстраваць з'явы тагачаснай рэчаіснасці, а яго сацыяльна-палітычныя погляды кваліфікаваліся як „супярэчлівыя" (Barysenka, 1957, s. 69). Відавочна, што В. Барысенка, тагачасны дырэктар Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР, ставіўся да марцінкевічаўскага твора і ўсёй творчасці пісьменніка, як да неадназначных у ідэйна-мастацкіх адносінах.

Зусім іншае, салідарнае з вывадамі С. Майхровіча, стаўленне да *Быліцаў, расказаў Навума* прадэманстраваў М. Ларчанка ў манаграфіі *На шляхах да рэалізма* (1958). Даследчык таксама ўбачыў у творы іронію з сатырай і нават сцвярджаў, што „… у сатырычным тоне паэмы *Халімон на каранацыі* знайшло сваё адлюстраванне незадавальненне сялянскіх мас антынародным царскім рэжымам"

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

(Larčanka, 1958, s. 222). Такія выказванні не выключалі магчымасць наступнага вываду, які ненавязліва напрошваўся, не толькі пра антытрадыцыяналісцкі, але і рэвалюцыйны характар *Халімона на каранацыі*.

З меркаваннем, што настолькі выкрывальны антысамадзяржаўны пафас твора выцякае з яго зместу, катэгарычна не пагадзіўся Міхась Лазарук. У даследаванні *Станаўленне беларускай паэмы (Жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў першай палавіне XIX ст.)* (1968), рэдактарам якога быў В. Барысенка, аўтар сцвярджаў:

> Але так ацэньваць твор нельга. *Халімон на каранацыі* – не толькі не з'яўляецца антыцарскім творам, а якраз наадварот, творам, у якім выявіліся царысцкія ілюзіі пісьменніка, погляды на цара як на бацьку славянскіх народаў і г.д. <…> Некаторыя даследчыкі знаходзяць у гэтых выразах злую іронію… Разумеецца ўсё гэта страшэнна пераўвялічана. Зусім відавочна, што за сатыру прымаецца бурлеск, які ў суседстве з сентыментальным стылем робіць уражанне сатырычнай іроніі, але іменна ўражанне. Сатыры сапраўднай тут няма (Lazaruk, 1968, s. 131).

У *Халімоне на каранацыі* сапраўды ёсць бурлескнасць – лагічная неадпаведнасць высокай тэмы і простай манеры яе выкладання. Аднак у той час беларуская мова была настолькі неапрацаванай, што, па сутнасці, у ёй яшчэ не было стылістычнай дыферэнцыяцыі. Лексікі, якая адпавядала б высокаму стылю, яўна бракавала В. Дуніну-Марцінкевічу, што выразна выявілася ў яго перакладзе на беларускую мову паэмы А. Міцкевіча *Пан Тадэвуш*.

У нашым канкрэтным выпадку не трэба безаглядна аддаваць перавагу падлеглым семантычнай аберацыі аргументам розных даследчыкаў, спрошчаным і, магчыма, з добрым намерам перакручаным, а паспрабаваць зрабіць спробу рэканструкцыі верагоднага чытацкага ўспрыняцця тэкстаў далёкай марцінкевічаўскай эпохі рознымі рэцыпіентамі. Пры гэтым абавязкова трэба ўлічваць такое шчырае прызнанне ў лісце (15.IX.1868) Марцінкевіча да Яна Карловіча:

> Я, пішучы апавяданнейкі не для дактароў і філасофіі, а для сялян, прыбіраў тых дзетак майго духу не ў эстэтычныя сукенкі, а ў простыя народныя сярмяжкі, *каб цёмны той народ не баяўся з імі пазабаўляцца* (курсіў наш – І.З.) (Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 420).

У гэтых радках заключана квінтэсенцыя несвабоднай творчай ініцыятывы, раскрываецца сутнасць строгай дысцыпліны пачынальніка новай беларускай літаратуры, які цудоўна ўсведамляў, што рабіў.

У падрыхтаваных у Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы АН БССР *Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры* (т. 2, 1969) і аднатомніку на рускай мове *История белорусской дооктябрьской литературы* (1977) аўтарам раздзелаў-персаналій, прысвечаных творчасці Марцінкевіча, быў Васіль Жураўлёў. Шукаючы ў нейкай ступені кампраміснае рашэнне паміж дзвюмя пазіцыямі, ён канстатаваў:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

> Халімон Забалотны мае шмат агульнага з тымі сялянамі-праўдашукальнікамі, у душы якіх не пагасла яшчэ надзея на царскую міласць (Žuraŭlioŭ, 1969, s. 111).

А ніжэй, не адмаўляючы наяўнасць у тэксце затоенай і горкай іроніі, сцвярджаў:

> Змест аповесці не дае, аднак, падстаў думаць, што пісьменнік ускладаў надзеі на добрую волю манарха. Цар нават не знайшоў часу ды і не імкнуўся прыняць у сябе і выслухаць скаргі і просьбы сваіх падданых (Žuraŭlioŭ, 1969, s. 111).

Перад намі відавочная дылема, якая палягае на наўпроставай трактоўцы вобраза галоўнага героя, або на выяўленні ўнутранай формы твора (А. Патабня), якая з'яўляецца вобразам ідэй. Слушна сцвярджае Лія Кісялёва:

> Ад савецкага літаратуразнаўцы патрабавалася адшукаць у кожным тэксце папярэдніх эпох элементы сацыяльнай крытыкі, сведчанні незадаволенасці і пратэсту супраць колішняга ладу. Інтэрпрэтацыйны алгарытм быў гранічна просты: тэксты, у якія шляхам больш ці менш адвольных маніпуляцый удавалася „ўчытаць" вышэйзгаданыя сэнсы, залічваліся да скарбаў сусветнай літаратуры; астатнія тэксты аб'яўляліся нізкамастацкімі і ігнараваліся. У рамках гэтай інтэрпрэтацыйнай мадэлі літаратуразнаўца мог адпаведна сваім талентам і здольнасцям дэманстраваць большую ці меншую гнуткасць думкі, нестандартнасць мыслення, свежасць погляду, але выйсці за вызначаныя межы яму было вельмі цяжка (Kisialiova, 2007, s. 42–43).

І гэтую акалічнасць абавязкова трэба ўлічваць. Відавочна, што ў *Быліцах*... В. Дунін-Марцінкевіч нават не імкнуўся прынцыпова адмовіцца ад ранейшых, уласцівых яго творам, дыдактыкі і маралізатарства, аднак аўтарам таксама засведчана, што з пункту гледжання праблематыкі ён упершыню спрабуе па-іншаму, сацыяльна і нават палітычна, актуалізаваць свой новы твор для патэнцыяльных чытачоў-сялян.

У вядомым падручніку для студэнтаў ВНУ (1-е выд. 1977, 2-е выд. 1989) не адмаўляў наяўнасць царысцкіх ілюзій у вобразе Забалотнага і прафесар Алег Лойка. Даследчык лічыў, што „адносіны героя да цара не назавеш прававерными" (Lojka, 1989, s. 165), бо ў тэксце твора ёсць і іранічная ўсмешачка, і паказ адарванасці цара ад мужыка і ўсяго народа, і паказушнасць працэдуры каранацыі, і рацыянальны аўтарскі погляд на рэчы, якія вышэй хімернай легенды пра „ўсенароднага" цара-бацюшку.

Укладальнікам выдання твораў пісьменніка 1984 года стаў Язэп Янушкевіч. У каментарыях да *Быліцаў*... ён адзначыў тэксталагічную гісторыю твора, тэкст якога быў надрукаваны з улікам кантамінацыі: рукапіснай копіі, знятай у канцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя І. Замоціным з рукапісаў В. Дуніна-Марцінкевіча і адшуканага Г. Кісялёвым у Рукапісным аддзеле Інстытута рускай літаратуры

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

АН СССР у Ленінградзе ліста-аўтографа пісьменніка, з прыкладзеным пачаткам *Былiц…*, які дазволіў узнавіць каля 50 радкоў твора. Паказальна, што ў манаграфіі Я. Янушкевіча *Беларускі Дудар…* (1991) знайшла падтрымку інтэрпрэтацыйная версія С. Майхровіча, а не М. Лазарука. Яна ж адлюстравана і ў раздзеле-персаналіі апошняй па часе выдання акадэмічнай *Гісторыі беларускай літаратуры XI–XIX ст.* (т. 2, 2007), аўтарам якога з'яўляецца Я. Янушкевіч.

Іншай думкі прытрымліваўся акадэмік Іван Навуменка ў манаграфіі *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч* (1992):

> Адным словам, Халімон – добранадзейны вернападданы. <…> Збавенне для народа ён бачыць толькі ў шчырай царскай ласцы. <…> Крытыка наша, каб дагадзіць грубым сацыялагічным схемам, нямала награшыла, прыпісваючы, скажам, селяніну рысы, якасці, якімі ён ніколі не вызначаўся (Navumienka, 1992, s. 143).

І працягваў:

> Але, паўтараем, перад намі „мужыцкая" паэма, і ў сваіх ацэнках пісьменнік не выходзіць за межы чыста сялянскіх уяўленняў. <…> У быліцы *Халімон на каранацыі* гумар – неад'емны элемент стылю, ён цячэ „падводнай" плынню, нібы падсвечваючы ўсё, аб чым ідзе гаворка ў творы (Navumienka, 1992, s. 145).

Даследчык не адмаўляў у вобразе Халімона здольнасць глядзець на падзеі „як бы збоку, з налётам лёгкай насмешкі„ (Navumienka, 1992, s. 146), але бачыў у творы гумар, а не сатыру. І, на нашу думку, абгрунтавана.

У параўнанні з папярэднімі творамі Марцінкевіча *Быліцы…* маюць значна больш складаную кампазіцыю. Твор пачынаецца зваротам *Навум да братоў мужыкоў*. Пасля яго ідзе першая быліца *Злая жонка*, якая складаецца з дзвюх песень – *Браты* і *Злая жонка*. Іх можна аднесці да традыцыйных „вясковых гісторый". У гэтых павучальных, насычаных адкрытай дыдактыкай творах выкарыстоўвалася ўласцівая ўсёй „літаратуры для народа" стэрэатыпная схема, звязаная з наўпроставай прапагандай ідэі, што парушэнне маральных норм цягне за сабою абавязковае пакаранне, – згодна з хрысціянскімі ўяўленнямі „віна павінна быць адпакутавана, а дабрачыннасць узнагароджана" (Bachórz, Kowalczykowa, 2002, s. 550).

Аналагічную двухчасткавую структуру мае і другая быліца *Халімон на каранацыі – Дарога* і *Каранацыя*. Кампазіцыйна ўвесь твор пабудаваны як „быліца ў быліцы", якія аб'яднаныя вобразам апавядальніка Навума. Неардынарнасць фабулы твора, яго нацыянальна-патрыятычныя матывы (гімн роднаму краю „Ой, нямаш зямелькі, як Літва радзона!" (Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 239), клопат героя аб тым, каб „паказаць чэсць беларуску" (Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 261) і інш., спробы індывідуалізацыі Халімона сведчаць аб творчай эвалюцыі В. Дуніна-Марцінкевіча як мастака народнага, беларуска-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

га, слова. Ён зразумеў, што яго ранейшая схільнасць да „чыстага" мастацкага этнаграфізму пры паказе народных абрадаў, своеасаблівае любаванне імі, нават пры абавязковым выкарыстанні драматызаваных любоўных калізій у сюжэце ўваходзіць у супярэчнасць з тым, што ён усё ж меў на мэце і што яму настойліва рэкамендавалі паплечнікі (У. Сыракомля, А. Плуг) – стварэнне „кніжнай" літаратуры для народа, а не твораў пра народ для адукаваных чытачоў.

Кампазіцыя *Быліцаў, расказаў Навума* – гэта не механічнае злучэнне дзвюх частак, а спецыфічнае іх размяшчэнне, абумоўленае ідэйным зместам твора для расстаноўкі патрэбных аўтару акцэнтаў. Імкненне будаваць аповед ад зразумелага сямейна-побытавага да больш складанага грамадска-палітычнага. У плане прасторава-часавых характарыстык увесь твор можна разглядаць як адну сцэну ў святочны дзень у карчме, дзе гуляюць вяскоўцы. Спачатку стары Навум знаёміць з гісторыяй сем'яў братоў Тодара і Сака Палеткаў, затым тут жа ў карчме адбываецца сутычка Тодара з яго злой жонкай Улянай, па віне якой згарэла іх хата і загінула дзіця. У канфлікт уцягнуты бацькі жанчыны і прысутныя. Дзякуючы просьбам маці, бацька жанчыны і яе муж даруюць правіны распусніцы. Аднак меладраматычная сцэна сямейных мітрэнгаў выбівае ўсіх з раўнавагі, усе разгублены, прыгнечаны і не маюць настрою да гульбішча. Каб выйсці з няёмкай сітуацыі і як-небудзь „развесяліцца" старшына Халімон Забалотны расказвае гісторыю сваёй паездкі ў Маскву і прыгодаў на каранаванні. У фінале Уляна зноў каецца перад бацькам і мужам, і ўсе „з вясёлай думою пабрылі дадому" (Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 277). Логіка кампазіцыйнай структуры тэкста, імкненне выклікаць і ўтрымліваць цікавасць чытача-слухача, лакалізацыя дзеяння ў адным памяшканні, павучальнасць і насычанасць твора дыялогамі, спецыфіка канфліктаў, меладраматызм і шчаслівы фінал раскрываюць прыкметы драматургічнага мыслення Марцінкевіча. Можна меркаваць, што *Злая жонка* з меладраматызмам яе калізій была разлічана на наіўнага чытача-вучня, а *Халімон…* арыентаваны на больш падрыхтаванага рэцыпіента, чытача-суразмоўцу.

На самой справе, у прынцыпова больш арыентаваных на сялянскую аўдыторыю *Быліцах…* зафіксавана стратэгія аўтара, яго новае разуменне запатрабаванняў патэнцыяльных чытачоў/слухачоў з адпаведнага сацыяльнага асяроддзя пры адлюстраванні жыццёвых рэалій, звязаных з іх светапоглядамі ўяўленнямі і каштоўнасцямі. Верагодна, што па парадзе А. Плуга Марцінкевіч узяўся шукаць такую жанравую форму, дзякуючы якой „побач з разумовым заняткам прасталюдзіны знайшлі б і святую навуку". І такая ўстаноўка адпавядала характару тагачасных дыскусій як пра тэндэнцыйнасць мастацкай творчасці, так і пра спецыфічныя асаблівасці „літаратуры для народа!, пераважна непісьменнага сялянства, інтэлектуальныя здольнасці якога прызнаваліся амаль прымітыўнымі. Так, нават выхадзец з сялянства Вінцэсь Каратынскі ў каментарыях да паэмы *Таміла* апраўдваўся перад чытачамі за тое, што выяўляў некаторыя думкі „не з дапамогай вобразаў, а проста праз апавяданне", бо „становішча нашага селяніна робіць яго не прыдатным да маральна свабоднай дзейнасці ў грамадстве"

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

(Karatynski, 1994, s. 179). Меркаванне пра тагачасную непадрыхтаванасць айчыннага чытача-селяніна, яго няздольнасць стаць паўнацэнным рэцыпіентам твораў на роднай мове не аднойчы паўтаралася адукаванымі сучаснікамі пісьменніка.

Пазней у гэтым бачылі адну з асноўных прычын маруднага развіцця новай беларускай літаратуры і працяглага крызісу ў поступе нацыянальнага прыгожага пісьменства. Аднак мастацкая эвалюцыя залежыць і ад суб'ектыўных фактараў, ад прыватнай ініцыятывы крэатыўных мастакоў слова, якім быў, можна з поўным правам сцвярджаць, і В. Дунін-Марцінкевіч. Сапраўды, у тыя часы носьбітамі адукаванасці лічыліся пераважна прадстаўнікі шляхты, „польскасць" і, адпаведна, адукаванасць шарачковай часткі якой таксама часта абмяжоўвалася веданнем некалькіх дзясяткаў польскіх слоў і ўменнем распісацца, зрэшты, з вялікай цяжкасцю.

Святлана Малюковіч, выкарыстаўшы параўнальна-супастаўляльны метад даследавання, у артыкуле *Аповесць Ю. І. Крашэўскага „Уляна" і паэтычны эпас В. Дуніна-Марцінкевіча (да тыпалогіі аднаго матыву)* выказала асцярожнае меркаванне:

> Можна дапусціць, што аповесць Крашэўскага *Уляна* ў нейкай ступені магла паслужыць арыенцірам у стварэнні вобраза злой жонкі беларускім аўтарам (Maliukovič, 2010).

І слушнасць такога дапушчэння ў адносінах „вясковай аповесці" Ю. Крашэўскага *Уляна* (1843) можна прызнаць цалкам верагодным. Заўважым, што ў 50-я гг. XX ст. у беларускім літаратуразнаўстве да твораў паэтычнага эпасу Марцінкевіча практыкавалася выкарыстоўваць аналагічнае жанравае вызначэнне – вясковая аповесць. Так, В. Барысенка пісаў:

> Сярод твораў Марцінкевіча дарэформенннага часу асноўнае месца займаюць вершаваныя „вясковыя аповесці" і паэмы. Марцінкевіча па праву можна лічыць пачынальнікам жанра „вясковых гісторый" у беларускай літаратуры (Barysenka, 1957, s. 92).

С. Малюковіч канстатавала:

> Сам жа Крашэўскі ўключаў *Уляну* ў раздзел „вясковыя аповесці" („powieści sielskie") сваіх выбраных твораў (Maliukovič, 2010).

Для твораў беларускамоўнага паэтычнага эпасу Марцінкевіч прапанаваў разнастайныя аўтарскія жанравыя вызначэнні: *Гапон – Беларуская аповесць*, *Купала – Народная аповесць*, *Травіца брат-сястрыца – Аповесць з мясцовай легенды*, *Шчароўскія дажынкі – Аповесць у 2-х абразках*. Гэтыя варыяцыі сведчаць аб тым, што ў сярэдзіне XIX ст. творам малой эпічнай формы даваліся розныя найменні. А ў *Быліцах, расказах Навума* жанравае вызначэнне зафік-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

савана ў назве твора. „БЫЛІЦА – жанравая разнавіднасць вершаванага апавядання, у аснову якога пакладзены аповед пра нейкі цікавы жыццёвы выпадак. <…> У сучасным літаратуразнаўстве гэты тэрмін не ўжываецца, а творы тыпу Б. называюцца вершаваным нарысам ці вершаваным рэпартажам", – слушна адзначае Вячаслаў Рагойша і як узор называе марцінкевічаўскі твор (Rahojša, 2001, s. 60). Унікальны выпадак. Можна меркаваць, што інавацыйная тэрміналагічная ініцыятыва пісьменніка не мела працягу праз цярністасць шляху твора да друкарскага станка.

Меў рацыю Мікола Грынчык, калі сцвярджаў:

> Пошукі В. Дуніна-Марцінкевіча ў галіне стварэння новых жанравых форм пачынаюцца, па сутнасці, з нулявога цыкла. Перад ім, як ні перад кім іншым, востра паўстае праблема выпрацоўкі, а па-сутнасці стварэння новых жанрава-стылістычных форм. Пісьменнік дастаткова эрудзіраваны, прафесійна дасведчаны, ён з самага пачатку меў перад сабою бясцэнныя ўзоры рускай і польскай літаратуры (Hryńčyk, 1975, s. 38–39).

Па меркаванні даследчыка, яго вывад пацвярджаюць марцінкевічаўскія польскамоўныя гераіка-рамантычныя паэмы *Люцынка, альбо Шведы на Літве* і *Славяне ў XIX стагоддзі*, а таксама наступнае назіранне:

> Калі пагартаць *Казачнік польскі* Глінскага, славутыя *Быліцы, старажытныя аповесці і легенды люду польскага і Русі* (у арыгінале *Klechdy: starożytne podania i powieści ludu polskiego i Rusi* (1837). – І. З.) Вуйціцкага, або, скажам, зборнік Я. Баршчэўскага *Шляхціц Завальня* і іншыя, то не цяжка ўстанавіць выразную пераклічку. Напрыклад, легенда *Брат і сястра* вельмі блізкая па свайму сюжэту да балады В. Дуніна-Марцінкевіча *Травіца брат-сястрыца* (аналагічны матыў апрацаваны ў вершы Баршчэўскага *Дзве бярозы*). Варта адзначыць блізкасць „вясковых гісторый" Марцінкевіча да народных аповесцей Даля, што адзначыў у свой час В.В. Барысенка. Зразумела, можна гаварыць і аб пэўным уплыве на вершаваныя аповесці Марцінкевіча вершаванай аповесці К. Брадзінскага *Веслаў* (Hryńčyk, 1975, s. 39–40).

Зрэшты, М. Грынчык не выключаў магчымасць адноснасці падобных аналогій.

На працягу дзясяцігоддзяў у літаратуразнаўстве замацавалася схема заканамернасцей культурна-гістарычнага і гісторыка-літаратурнага працэсаў. Яна звязана пераважна з тэорыяй няўхільнай эвалюцыі ад сентыменталізму і рамантызму да рэалізму, вышэйшай праявай якога ў савецкім літаратуразнаўстве быў абвешчаны спачатку крытычны, а затым сацыялістычны рэалізм.

Смелы пошук Марцінкевіча, які знайшоў адлюстраванне ў *Быліцах, расказах Навума*, яго наватарскае імкненне разнастаіць праблематыку, формы і сродкі мастацкага выражэння, нарэшце, жанравую адметнасць свайго новага

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

твора і выклікалі дыскусію наконт ідэйна-змястоўнай яго скіраванасці. Як асветнік, зрабіўшы стаўку і маючы на мэце істотны ўплыў на духоўнае і маральнае развіццё сялянства, пераважна прыгоннага, аўтар *Гапона, Вечарніц, Купалы і Шчароўскіх дажынак* праявіў сябе ў якасна новай іпастасі не толькі адкрытага дыдактыка і маралізатара, мастацкага „этнаграфіста", які прапануе ўвазе нескладаную любоўную інтрыгу на фоне эпічных абрадавых святаў і звычаяў. Ён смела паспрабаваў заінтрыгаваць навізной і маштабнасцю прапанаванай тэматыкі, здзівіць вобразам новага героя, змястоўна значнага, маральна высакароднага і этнічна свядомага. На апошняй, нацыясамаўсведамленчай інтэнцыі героя асабліва акцэнтаваў увагу даследчык Аляксей Каўка (Kaŭka, 1989, s. 167).

Першая частка *Быліцаў… Злая жонка* вытрымана ў традыцыйным для Марцінкевіча рэчышчы – гэта сямейна-бытавое апавяданне ў тэматычна-стылёвым плане з індывідуальна-псіхалагічнай праблематыкай. *Халімон на каранацыі* – гэта твор грамадска-палітычнага зместу. Паводле аўтарскай логікі не цар, а Забалотны з'яўляецца ў іерархіі персанажаў галоўным героем, адлюстраванню яго індывідуальных рыс надаецца ключавая роля. Імператар пры гэтым выступае ў якасці персанажа другога плана. Найважнейшае ў *Халімоне на каранацыі* не ўрачыстая цырымонія, так званае „народнае свята", а тое, як яго ўспрымае галоўны герой і яго паводзіны пры гэтым. На нашу думку, менавіта па гэтай прычыне, а не праз „іранічную ўсмешачку" твор не быў адобраны да друку цэнзарам Паўлам Кукальнікам, у цэлым прыхільным да беларускамоўнай літаратурнай творчасці.

Знаёмства Халімона з царом і іх размова не адбыліся, але не таму, што манарх далёкі ад народа і абыякавы да яго патрэб. Са зместу твора адназначна вынікае, што так сталася праз занятасць імператара дзяржаўнымі справамі знешняй палітыкі:

> Назаўтра падумаў: царок кончыў дзела,
> Яму з Забалотным бачыцца прыспела;
> Да гдзе там, браточкі! заморскі панята
> Абляглі, вось матку дробныя курчата.
> (Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 277).

Зразумела, такое стылістычна-зніжанае параўнанне ў тэксце амаль сакральнай асобы самадзержца з сучкай выключала для твора магчымасць атрымання цэнзурнага дазволу.

Пасля паразы ў Крымскай вайне грандыёзная каранацыя і яе пампезныя ўрачыстасці былі разлічаны на тое, каб больш уразіць замежных паслоў, а не сваіх падданых з розных сацыяльных станаў і тэрыторый імперыі. Па тагачасных ідэалагічных канонах манарх мусіў стаць для ўсіх клапатлівым бацькам, аднолькава да ўсіх ставіцца і апекавацца. Халімон захоплена апавядае пра цырымонію каранацыі, што служыла ўзвелічэнню магутнасці імперыі. А вось сцэны зладзей-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

ства і асабліва выратавання кабеты з дзіцем у раз'юшаным натоўпе ў негатыўным святле малююць масквічоў, грамадзян імперыі ў цэлым і, асабліва, арганізатараў мерапрыемства.

Карціны каранацыі, намаляваныя ў *Халімоне*..., у многім не карэлююць з захопленым апісаннем, пададзеным у *Запісных кніжках* паэта, крытыка і мемуарыста князя Пятра Вяземскага, які са снежня 1856 па сакавік 1858 года ўзначальваў Галоўнае ўпраўленне цэнзуры пры Міністэрстве народнай асветы Расійскай імперыі. Прывядзём фрагменты запісу, датаванага 15 верасня 1856 г.:

> Каля месяца правёў у Маскве і ледзь паспяваў перавесці дыханне. Такі перазвон, такая страляніна, мітусня, што галава круцілася і сэрца замірала. Былі хвіліны цудоўныя, урачыстыя і незабыўныя. Асабліва цудоўнымі былі дзень уезда і дзень каранавання. Ніякі горад у свеце так не здольны і не зручны для падобных урачыстасцяў. Ні Рым, ні Царград не могуць паспрачацца з Масквой у гэтых адносінах. Ды і рускі народ асабліва харошы ў такіх выпадках. Гэтыя ціхія грамады, ціхія не ад нячуласці і крывадушнасці, але ад глыбокай пашаны і расчуленасці. На такіх святах рэлігійнае пачуццё перавышае і пераадольвае ўсе іншыя пачуцці. На вуліцах рускі народ пры ўдарах званоў і пры ўрачыстым шэсці цара — нібы ў царкве. Ён больш моліцца і хрысціцца, чым крычыць „ура!". Рускі народ пры кожнай радасці, перш чым ускрыкнуць ці пляскаць у ладкі, ахінаецца крыжам і душу ўзносіць да Бога. Замежнікі здзіўляюцца ад гэтай цішыні народа і прыпісваюць яе паліцыі і народнай паслухмянасці ёй. Зусім не. Народ наш <…> больш за ўсё царалюбівы і багамольны, гэта значыць тое, што ён ёсць пераважна па ўласцівасці і глыбіні сваёй душы (Vâzemskij, 2017, s. 581).

Нязначная прысутнасць у стылістыцы Марцінкевіча экзальтаванай рэлігійнай замілаванасці, верагодна, і стала яшчэ адной з важкіх прычын для П. Кукальніка пры недапушчэнні твора ў друк.

Вобраз Базыля Шавалонка не патрабуе асаблівых ацэнак і характарыстык, яго функцыя дапаможная. Гэта пэўны тып-схема, лічы, амаль безаблічнага спадарожніка Халімона, прадстаўніка Пінскага павета, багатага на ўюноў. Разам з прысутным на каранацыі другім старшыною „з Віленскай зямелькі, – роўнага нам чынам" (Dunìn-Marcìnkevìč, 2008, s. 277), яны утрох рэпрэзентуюць прадстаўнікоў розных рэгіёнаў Паўночна-Заходняга краю, сімвалізуюць як дэмакратычнасць намераў новага цара, так і масавасць яго народнай падтрымкі. Што датычыць духу часу, у творы асобы чыноўніцкай бюракратыі паслядоўна характарызуюцца як своеасаблівая апазіцыя самадзяржаўю, лішняе звяно паміж народам і манархам, фактычна заклапочанае толькі захаваннем сваёй улады. Для ідэалогіі Расійскай імперыі ў сярэдзіне XIX ст. быў характэрны этатызм – кірунак палітычнай думкі, які разглядае дзяржаву як вышэйшы вынік і мэту грамадскага развіцця.

Вядома, у чым пераконвае і паэма *Энеіда навыварат*, што бурлеск апрыёры не стасуецца для раскрыцця характараў герояў. Але ж Халімон – вобраз індывідуалізаваны, у пэўнай ступені, з раскрытай псіхалогіяй. Таму

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

з катэгарычным вывадам М. Лазарука толькі часткова можна пагадзіцца, як нельга пагадзіцца і з тым, што *Халімон на каранацыі* – сатырычны твор. Арыентаваныя на масавага дэмакратычнага чытача *Быліцы…* не былі ні камічна-сатырычным творам, ні творам цалкам бурлескным. Выкарыстоўваючы фармуліроўку М. Лазарука, знешне гэта бурлеск, але толькі ў фармальных адносінах.

У творчай спадчыне В. Дуніна-Марцінкевіча *Быліцы, расказы Навума* – твор наватарскі як па тэматыцы і праблематыцы, вобразу галоўнага героя, так і ў жанравых і кампазіцыйных адносінах. У ім адлюстраваліся ідэйна-эстэтычныя пошукі пісьменніка, эвалюцыя яго поглядаў на літаратуру для народа. У творы найменш адчуваецца фальклорнае ўздзеянне, хоць вусна-паэтычныя дэталі і вобразнасць уплываюць на аповед.

Тагачаснае ажыўленне грамадска-палітычнага жыцця, абвастрэнне сацыяльнага і нацыянальнага пытанняў, рост асветніцкіх інтэнцый і этнічнага самаўсведамлення ў асяроддзі інтэлігенцыі і сялянства, актывізацыя пераходу ў літаратуры ад эстэтык сентыменталізму і рамантызму да рэалізму, папулярнасць жанравай формы падарожжа, якая досыць інтэнсіўна выкарыстоўвалася ў той час, уплыў міжлітаратурных сувязей і інш. – вось тыя працэсы і з'явы, якія паўплывалі як на асаблівасці літаратурнага працэсу ў Беларусі ў другой палове 50-х гг. XIX ст., так і на паэтыку *Быліцаў, расказаў Навума*, спецыфічным чынам выяўляючы заканамернасці літаратурнага развіцця.

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Adamovìč, Anton. (2005). *Da gìstoryì belaruskae lìtaratury*. Mìnsk: Vydaviec ÌP Z′mìcer Kolas. [Адамовіч, Антон. (2005). *Да гісторыі беларускае літаратуры*. Мінск: Выдавец ІП Зьміцер Колас].

Babarèka, Adam. (2011). *Belaruskaâ lìtaratura da X gadavìny BSSR: Stèzavany aglâd*. T. 1: *Lìtaraturna-krytyčnyâ pracy* (s. 425–432). Vìl′nâ: Ìnstytut belarusìstykì. [Бабарэка, Адам. (2011). *Беларуская літаратура да X гадавіны БССР: Стэзаваны агляд*. Т. 1: *Літаратурна-крытычныя працы* (с. 425–432). Вільня: Інстытут беларусістыкі].

Bachórz, Józef, Kowalczykowa, Alina (red.). (2002). *Literatura dla ludu. Słownik literatury polskiej XIX wieku* (s. 550–551). Wrocław etc.: Wydawnictwo Zakładu narodowego im. Ossolińskich.

Barysenka, Vasìl′. (1957). *Francìšak Bagušèvìč ì prablema rèalìzma ŭ belaruskaj lìtaratury XIX stagoddzâ.* Minsk: Vydaviectva AN BSSR. [Барысенка, Васіль. (1957). *Францішак Багушэвіч і праблема рэалізма ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя*. Мінск: Выдавецтва АН БССР].

Belaruskaâ lìtaratura. Padručnìk dlâ VIII klasa sârèdnâj školy. (1949). Minsk: Dzâržaŭnae vydaviectva BSSR, Rèdakcyâ vučèbna-pedagagìčnaj lìtaratury. [*Беларуская літаратура. Падручнік для VIII класа сярэдняй школы*. (1949). Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя вучэбна-педагагічнай літаратуры].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Bèndè, Lukaš. (1946). Nedrukavanyâ tvory V. Dunìna-Marcìnkevìča. *Polymâ*, 8/9, s. 91–93. [Бэндэ, Лукаш. (1946). Недрукаваныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча. *Полымя*, 8/9, с. 91–93].

Bèndè, Lukaš. (1933). *Vìncènt Dunìn-Marcynkevìč (1807–1884), Lìtaratura. Hrèstamatyâ dlâ sârèdnâj školy. Častka 1 (šosty god). Darèvalûcyjnaâ lìtaratura* (s. 17–31). Mensk: Dzâržaŭnae vydaviectva Belarusì. [Бэндэ, Лукаш. (1933). *Вінцэнт Дунін-Марцынкевіч (1807–1884), Літаратура. Хрэстаматыя для сярэдняй школы. Частка 1 (шосты год). Дарэвалюцыйная літаратура* (с. 17–31). Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі].

Chronika. (1948). U Instytucie litaratury, movy i mastactva. *Viesci Akademii Navuk Bielaruskaj SSR*, 4, s. 127. [Хроніка. (1948). У Інстытуце літаратуры, мовы і мастацтва. *Весці Акадэміі Навук Беларускай ССР*, 4, с. 127].

Dunìn-Marcìnkevìč, Vincent. (2008). *Zbor tvoraŭ.* T. 2: *Vieršavanyja apoviesci i apaviadanni, vieršy, publicystyka, listy i paslanni, pieraklady, Dubia.* Minsk: Mastackaja litaratura. [Дунін-Марцінкевіч, Вінцэнт. (2008). *Збор твораў.* Т. 2: *Вершаваныя аповесці і апавяданні, вершы, публіцыстыка, лісты і пасланні, пераклады, Dubia*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Gnìlamiodaŭ, Uladzìmìr. (2001). *Ad daŭnìny da sučasnascì: Narys pra belaruskuû paèzìû.* Minsk*:* Mastackaâ lìtaratura. [Гніламёдаў, Уладзімір. (2001). *Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Hrynčyk, Mikola. (1975). Niekatoryja asablivasci žanravaha razviccia bielaruskaj litaratury XIX – pačatku XX stahoddzia. U: *Bielaruskaja litaratura i litaraturaznaŭstva. Mižvuzaŭski zbornik*, vyp. 3 (s. 34–44). Minsk: Vydaviectva BDU. [Грынчык, Мікола. (1975). Некаторыя асаблівасці жанравага развіцця беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзя. У: *Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Міжвузаўскі зборнік*, вып. 3 (с. 34–44). Мінск: Выдавецтва БДУ].

Karatynski, Vinceś. (1994). *Tvory*. 2 vyd., dap. Minsk: Mastackaja litaratura. [Каратынскі, Вінцэсь. (1994). *Творы*. 2 выд., дап. Мінск: Мастацкая літаратура].

Kaŭka, Aliaksiej. (1989). *Tut moj narod: Francišak Skaryna i bielaruskaja litaratura XVI – pačatku XX stst*. Minsk: Mastackaja litaratura. [Каўка, Аляксей. (1989). *Тут мой народ: Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI – пачатку XX стст*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Kisialioŭ, Hienadź. (1994). Pasluchajcie, bratki, Navuma staroha. U: *Radavodnaje dreva: Kalinoŭski – epocha – nastupniki* (s. 104–119). Minsk: Mastackaja litaratura. [Кісялёў, Генадзь. (1994). Паслухайце, браткі, Навума старога. У: *Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі* (с. 104–119). Мінск: Мастацкая літаратура].

Kisialioŭ, Hienadź. (1988). *Spascihajučy Dunina-Marcinkieviča: Sproba navukovaj sistematyzacyi dakumientaŭ i materyjalaŭ*. Minsk: Univiersiteckaje. [Кісялёў, Генадзь. (1988). *Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: Спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў*. Мінск: Універсітэцкае].

Kisialiova, Lija. (2007). *Marhinalii: Bielaruskaja humarystyčnaja litaratura XIX – pačatku XX st. u sviatlie sučasnych litaraturaznaŭčych kancepcyj*. Minsk: Miedisont. [Кісялёва, Лія. (2007). *Маргіналіі: Беларуская гумарыстычная літаратура XIX – пачатку XX ст. у святле сучасных літаратуразнаўчых канцэпцый*. Мінск: Медисонт].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Konan, Uladzimir. (1991). Ivan Zamocin: na sumiežžy dzviuch kuĺtur. U: Ivan Zamocin. *Tvory: Litaraturna-krytyčnyja artykuly* (s. 3–32). Minsk: Mastackaja litaratura. [Конан, Уладзімір. (1991). Іван Замоцін: на сумежжы дзвюх культур. У: Іван Замоцін. *Творы: Літаратурна-крытычныя артыкулы* (с. 3–32). Мінск: Мастацкая літаратура].

Larčanka, Michaś. (1958). *Na šliachach da realizma*. Minsk: Vydaviectva BDU imia U.I. Lienina. [Ларчанка, Міхась. (1958). *На шляхах да рэалізма*. Мінск: Выдавецтва БДУ імя У.І. Леніна].

Lazaruk, Michaś. (1968). *Stanaŭliennie bielaruskaj paemy (Žanr paemy i niekatoryja asablivasci razviccia bielaruskaj litaratury ŭ pieršaj palavinie XIX st.)*. Minsk: Navuka i technika. [Лазарук, Міхась. (1968). *Станаўленне беларускай паэмы (Жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў першай палавіне XIX ст.)*. Мінск: Навука і тэхніка].

Lojka, Alieh. (1989). *Historyja bielaruskaj litaratury. Dakastryčnicki pieryjad: Častka 1*. 2 vyd., daprac. i dap. Minsk: Vyšejšaja škola. [Лойка, Алег. (1989*). Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: Частка 1*. 2 выд., дапрац. і дап. Мінск: Вышэйшая школа].

Majchrovič, Sciapan. (1957). *Narysy bielaruskaj litaratury XIX stahoddzia*. Minsk: Dziaržaŭnaje vučebna-piedahahičnaje vydaviectva Ministerstva asviety BSSR. [Майхровіч, Сцяпан. (1957). *Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя*. Мінск: Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства асветы БССР].

Majchrovič, Sciapan. (1955). *V.I. Dunin-Marcinkievič*. Minsk: Dziaržaŭnaje vydaviectva BSSR. Redakcyja mastackaj litaratury. [Майхровіч, Сцяпан. (1955). *В.І. Дунін-Марцінкевіч*. Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Рэдакцыя мастацкай літаратуры].

Maĺdzis, Adam (red.). (2013). *Litaratura Bielarusi XIX stahoddzia: antalohija*. Minsk: Bielaruskaja navuka. [Мальдзіс, Адам (рэд.). (2013). *Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: анталогія*. Мінск: Беларуская навука].

Maliukovič, Sviatlana. (2010). *Apoviesć Ju. I. Krašeŭskaha «Uliana» i paetyčny epas V. Dunina-Marcinkieviča (da typalohii adnaho matyvu)*. [Малюковіч, Святлана. (2010). *Аповесць Ю. І. Крашэўскага «Уляна» і паэтычны эпас В. Дуніна-Марцінкевіча (да тыпалогіі аднаго матыву)*]. Pobrano z: http://elib.bsu.by/handle/123456789/55009 (dostęp: 13.01.2021).

Navumienka, Ivan. (1992). *Vincent Dunin-Marcinkievič*. Minsk: Navuka i technika. [Навуменка, Іван. (1992). *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*. Мінск: Навука і тэхніка].

Ogarev, Nikolaj. (1988). Čto nužno narodu? *O literature i iskusstve* (s. 67–74). Moskva: Sovremennik. [Огарев, Николай. (1988). Что нужно народу? *О литературе и искусстве* (с. 67–74). Москва: Современник].

Paŭlovič, Aĺbiert. (1925). Zabytaje. *Polymia*, 6, s. 163–175. [Паўловіч, Альберт. (1925). Забытае. *Полымя*, 6, с. 163–175].

Piatrovič, M. (1934). Dunin-Marcynkievič (artykul). U: Alieś Kučar (red.). *Litaratura. Chrestamatyja dlia siaredniaj školy. Vośmy hod navučannia. Darevaliucyjnaja litaratura* (s. 45–57). Miensk: Dziaržaŭnaje vydaviectva Bielarusi. Vučpiedsiektar. [Пятровіч, М. (1934). Дунін-Марцынкевіч (артыкул). У: Алесь Кучар (рэд.). *Літаратура.*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Хрэстаматыя для сярэдняй школы. Восьмы год навучання. Дарэвалюцыйная літаратура (с. 45–57). Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Вучпедсектар].

Plug, Adam. (2010). Adam Plug pra gascâvanne ŭ Mìnsku ŭ 1856 g. U: Genadzʹ Kìsâlëv (red.). *Marcìnkevìč gerba Lebedzʹ: Dakumenty ì matèryâly pra klasika belaruskaj lìtaratury XIX st. Vìncènta Dunìna-Marcìnkevìča* (s. 153–177). Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Плуг, Адам. (2010). Адам Плуг пра гасцяванне ў Мінску ў 1856 г. У: Генадзь Кісялёў (рэд.). *Марцінкевіч герба Лебедзь: Дакументы і матэрыялы пра класіка беларускай літаратуры XIX ст. Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча* (с. 153–177). Мінск: Беларуская навука].

Prahrama pa bielaruskaj litaratury dlia 8, 9 i 10 klasaŭ siaredniaj školy i piedahahičnych technikumaŭ (prajekt). (1935). Miensk: Dziaržaŭnaje vydaviectva Bielarusi. Vučpiedsiektar. [*Праграма па беларускай літаратуры для 8, 9 і 10 класаў сярэдняй школы і педагагічных тэхнікумаў (праект)*. (1935). Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Вучпедсектар].

Pšyrkoŭ, Ûlʹân (red.). (1950). *Belaruskaâ lìtaratura* XIX *stagoddzâ: Zbornìk tèkstaŭ*. Minsk: Vydaviectva AN BSSR. [Пшыркоў, Юльян (рэд.). (1950). *Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Зборнік тэкстаў*. (1950). Мінск: Выдавецтва АН БССР].

Rahojša, Viačaslaŭ. (2001). *Teoryja litaratury ŭ terminach: Dapamožnik*. Minsk: Bielaruskaja Encyklapiedyja. [Рагойша, Вячаслаў. (2001). *Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: Дапаможнік*. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя].

Syrakomlia, Uladzislaŭ. (2011). *Vybranyja tvory*. Minsk: Bielaruskaja navuka. [Сыракомля, Уладзіслаў. (2011). *Выбраныя творы*. Мінск: Беларуская навука].

Vâzemskij, Petr. (2017). *Zapisnye knižki.* Moskva: Zaharov. [Вяземский, Петр. (2017). *Записные книжки.* Москва: Захаров].

Zamocin, Ivan. (1991) *Tvory: Litaraturna-krytyčnyja artykuly*. Minsk: Mastackaja litaratura. [Замоцін, Іван. (1991) *Творы: Літаратурна-крытычныя артыкулы*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Žuraŭlioŭ, Vasiĺ. (1969). V.I. Dunin-Marcinkievič, *Historyja bielaruskaj dakastryčnickaj litaratury.* T. 2: *Litaratura XIX – pačatku XX st.* (s. 91–127). Minsk: Navuka i technika. [Жураўлёў, Васіль. (1969). В. І. Дунін-Марцінкевіч, *Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры.* Т. 2: *Літаратура XIX – пачатку XX ст.* (с. 91–127). Мінск: Навука і тэхніка].

SUBMITTED: 2.02.2022
ACCEPTED: 10.10.2022
PUBLISHED ONLINE: 22.12.2022

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Ihar Zaprudski / Ігар Запрудскі – Białoruś, Mińsk, Białoruski Uniwersytet Państwowy, Wydział Filologiczny; dr, docent; spec.: literaturoznawstwo; zainteresowania naukowe: literatura białoruska XIX w., związki polsko-białoruskie; e-mail: zaprudzki@gmail.com.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 20:17:47

Adres: Кафедра гісторыі беларускай літаратуры, філалагічны факультэт БДУ, вул. К. Маркса, 31, Мінск, 220000, Беларусь.

Wybrane publikacje:

1. Запрудскі, Ігар. (2003). *Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя*. Мінск: РІВШ БДУ.
2. Запрудскі, Ігар. (2012). *Па дарозе на Парнас. Атрыбуцыйныя даследаванні і пытанні рэцэпцыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя*. Мінск: БДУ.
3. Запрудскі, Ігар. (2013). *Метафізіка беларускай літаратурнай крытыкі: артыкулы, нататкі, рэцэнзіі, водгукі*. Мінск: БДУ.
4. Запрудскі, Ігар. (2018). *Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя: асобы і творчыя лёсы*. Мінск: БДУ.
5. Запрудскі, Ігар. (2021). *Беларуская літаратура і культура XIX стагоддзя: асаблівасці развіцця і актуальныя пытанні даследавання*. Мінск: БДУ.

UMCS